Азёры

Аўтар: Андрэй Вашкевіч
18.04.2021 00:00



Азёры – адно з самых старых мястэчак у ваколіцах Гродна. Асобная парафія тут паўстала ў 1676 годзе. На плошчы мястэчка Азёры побач стаяць праваслаўная царква і каталіцкі касцёл. Гэта важны сімвал рэлігійнага міру, які пануе ў нашай краіне. Так было і больш за шэсць стагоддзяў таму, калі праваслаўныя і католікі прыйшлі ў лясны край і пачалі засвойваць пушчу, што атрымала назву Гродзенскай.

Азёры – адно з самых старых мястэчак у ваколіцах Гродна. Яно згадваецца яшчэ ў канцы XIV стагоддзя ў справаздачах крыжацкіх шпіёнаў, якія планавалі напады на Вялікае Княства Літоўскае і хацелі выведаць маршруты ўглыб нашай дзяржавы. Каталіцкай парафіі ў той час, у XV стагоддзі, у Азёрах яшчэ не было, але, хутчэй за ўсё, ужо існавала філіяльная капліца, якая належала да фарнай парафіі ў Гродне. † Асоб ная парафія ў Азёрах паўстала ў 1676 годзе. Праз некалькі гадоў быў пабудаваны драўляны касцёл Маці Божай Ружанцовай, а парафія атрымала фундуш – 212 дзесяцін зямлі з каралеўскіх валоданняў. У XVIII стагоддзі пушчу працягвалі актыўна засвойваць. Ствараліся прадпрыемствы па здабычы жалезнай руды (адсюль вёскі з назвай Руда, Рудня), вытворчасцю дзёгцю, поташу, а таксама лесапілкі. Таму выраставалі і населеныя пункты ў вялікакняскай пушчы. Напрыклад, у апісанні азёрскай парафіі 1784 года згадваюцца два вадзяныя млыны, пры дапамозе якіх не толькі малолі збожжа, але і апрацоўвалі сукно, і пілілі бярвенне. Ужо тады ў парафію ўваходзіла каля 30-ці населеных пунктаў: каралеўскія двары, шляхецкія засценкі, вёскі рымска-каталіцкага і грэка-каталіцкага абрадаў.

Азёры

Аўтар: Андрэй Вашкевіч
18.04.2021 00:00

